УДК 94 (476) “1630-1640”

# БЕРАСЦЕЙСКІ ПАВЕТ У ПАЛІТЫЧНАЙ ГЕАГРАФІІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў 1630 – 1640-я гг.

***канд. гіст. навук, дац. В.У. ГАЛУБОВІЧ***
***(Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт)***

*У артыкуле прадстаўлены вынікі вывучэння ролі і месца Берасцейскага павета ў палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага ў 1630 –1640-я гады. Аўтар звярнуў увагу на недаследаванасць лакальнай палітычнай гісторыі ў беларускай гістарыяграфіі і фрагментарнасці звестак пра спецыфіку структуры палітычных сіл на Берасцейшчыне ў замежнай навуковай літаратуры. У артыкуле адзначаецца, што палітычная канкурэнцыя ў Берасцейскім павеце была адлюстраваннем працэсаў, якія адбываліся на агульнадзяржаўным узроўні. Кіраўніцтва Берасцейскага ваяводства на працягу 1630 – 1640-х гг. змянялася некалькі разоў, а ваяводамі былі асобы, якія належалі да трох розных палітычных групіровак, у тым ліку Радзівілаўскай і Сапежанскай. Лакальная адміністрацыя павета фарміравалася з мясцовых шляхціцаў, якія арыентаваліся на адну з палітычных груп. Нягледзячы на тое, што галоўныя ваяводскія і павятовыя пасады належалі каталікам і ўніятам, сярод мясцовай шляхты вялікай папулярнасцю карысталася пратэстанцкая групоўка Вялікага Княства Літоўскага на чале з біржанскімі Радзівіламі. Адным з павятовых лідараў і галоўным рэпрэзентантам інтарэсаў іншаверцаў на соймах Рэчы Паспалітай з’яўляўся знакаміты берасцейскі шляхціц Пётр Кахлеўскі.*

***Ключавыя словы:*** *шляхта, Берасцейскі павет, Вялікае Княства Літоўскае, ваявода, Радзівілы, Сапегі.*

**Уводзіны.** У айчыннай навуцы вывучэнню гісторыі палітычных працэсаў у перыяд уваходжання беларускіх зямель у склад Рэчы Паспалітай адводзіцца адносна сціплае месца. Відавочныя прабелы ў вялікай ступені кампенсуюцца за кошт актыўнай працы суседзяў, пераважна польскай гістарыяграфіі. Гэта датычыцца як характарыстыкі на макра-, так і на мікраўзроўні, але далёка не ўсё паспяваюць зрабіць нават нашы гіперактыўныя суседзі. Іх намаганнямі дэтальна рэканструіравана агульная лінія флуктуацыі палітычнага жыцця ВКЛ у XVI – XVIII стст., таму, на сённяшні дзень, маюцца грунтоўныя падставы для развага над тым, якія палітычныя калізіі маглі мець месца ў асобных паветах гэтай дзяржавы [1; 2]. *Аднак адкрытым застаецца пытанне адносна таго, як агульныя тэндэнцыі палітычнага жыцця карэліраваліся з лакальным раскладам інтарэсаў на павятовым узроўні, у тым ліку і на Берасцейшчыне.* Перспектывы даследаванняў у гэтым накірунку значныя, паколькі ёсць даволі істотныя напрацоўкі.

Паспрабуем гэта праілюстраваць толькі на адным невялікім гістарычным адрэзку, які ахоплівае пачатак 30-х – канец 40-х гадоў XVII ст. Вялікую каштоўнасць для гэтага ўяўляюць працы наступных даследчыкаў. У першую, чаргу варта згадаць агляд некалькіх выбарчых кампаній у Вялікім Княстве Літоўскім у 1640-я гады. Ён зроблены польскім гісторыкам Генрыхам Люлевічам у дысертацыйнай працы, абароненай у Варшаўскім ўніверсітэце яшчэ ў 1984 г. [3, s. 299–317]. Характарыстыка так званых радзівілаўскіх соймікаў вядомая дзякуючы Уршулі Аўгустыняк, якая звярнула ўвагу на наяўнасць лакальнай падтрымкі ў біржанскіх Радзівілаў на берасцейскім сойміке [4, s. 194–254]. Непасрэдныя адносіны да тэмы нашага артыкула маюць даследаванні Анджэя Рахубы, які вызначыў месца асобных рэгіёнаў у палітычнай гульні магнацкага роду Сапег і намінацыйнай палітыцы [5; 6]. Бадай, найбольш блізка да абранай намі праблематыкі падыйшоў Марыюш Савіцкі, але яго даследаванне мае выбарачны характар [7]. Нарэшце, варта нагадаць і пра наяўнасць асобнай манаграфіі па гісторыі сойміка Берасцейскага павета. Яна падрыхтавана Дыянай Канечнай, якая, на жаль, засяродзіла сваю ўвагу толькі на функцыянальных аспектах дзейнасці ўстановы лакальнага шляхецкага самакіравання [8]. Кожны з пералічаных аўтараў прэзентаваў каштоўныя, але толькі фрагментарныя звесткі пра лакальную палітычную сітуацыю. Гэта прымушае нас прадпрыняць спробу абагульнення выяўленай інфармацыі, яе структурызацыі з улікам патрэб айчыннай гістарыягафіі ў адаптацыі раней малавывучанаай праблематыкі і неабходнасці засваення стандартаў метадалогіі гістарычных даследаванняў.

**Генеральны расклад сіл: вопыт гістарычнай дэдукцыі.** Пачаць трэба з агульнай характарыстыкі раскладу палітычных сіл у ВКЛ у 1630 – 1640-я гг. На гэты час грамадскае жыццё ў княстве віравала паміж некалькімі палюсамі, магнетызм і вага кожнага з якіх з часам змяняліся. Галоўнымі гульцамі ў гэты час былі групоўкі біржанскіх і нясвіжскіх Радзівілаў, а таксама Сапег. Акрамя таго, дзейнічалі і менш уплывовыя групы, менш самастойныя і арыентаваныя на каралеўскі двор [2, с. 39–41]. Уплывы галоўных суб’ектаў палітычнага спаборніцтва ў значнай ступені вызначаліся працягласцю жыцця і сталасцю найбольш аўтарытэтных прадстаўнікоў груповак. Перавага Сапег у апошнія гады праўлення Жыгімонта Вазы і пэўны

парытэт сіл у першыя гады Уладзіслава Вазы скончыліся для іх суцэльнай катастрофай у сярэдзіне 1630-х гадоў. Гэтым, у першую чаргу, пакарысталіся біржанскія Радзівілы на чале з Крыштафам, які атрымаў вышэйшыя дзяржаўныя ўрады ў княстве – віленскага ваяводы ў 1633 г. і вялікага гетмана ў 1635 г. [9, s. 195; 10, s. 43]. Але смерць харызматычнага лідара пратэстантаў у 1640 г. і жаданне Уладзіслава стрымаць аднаўленне ўплываў біржанскіх Радзівілаў ураўнаважыла сілы галоўных груповак у 1640-я гады [2, с. 40]. У значнай ступені гэтая агульная тэндэнцыя карэлюецца з тым, што адбывалася ў паветах.

**Сенатары (ваяводы і кашталяны): асобы, арыенціры.** У часы праўлення Уладзіслава Вазы пасада Берасцейскага ваяводы ўваходзіла ў лік самых прахадных у ВКЛ. На працягу вылучанага перыяду ваяводамі паспелі пабыць пяць чалавек, што роўна маргінальму, Мсціслаўскаму, ваяводству і цэнтральнаму, Менскаму, ваяводству, кіраўніцтва якога змяняляся столькі ж разоў [11, s. 9–10, 30–31, 26–27]. Ужо сам фактар зменлівасці "твараў" на чале галоўнага ўрада ў ваяводстве ператварала палітычнае жыццё ў павеце ў своеасаблівы калейдаскоп. Берасцейскімі ваяводамі ў 1630 – 40-я гг. былі:

- Аляксандр Людвік Радзівіл з 1631 па 1635 гг. Далей перайшоў на ўрад надворнага маршалка ВКЛ;
- Ян Ракоўскі з 1635 па 1638 гг. Далей перайшоў на ўрад віцебскага ваяводы;
- Мікалай Сапега з 1638 па 1642 гг. Далей перайшоў на пасаду віленскага кашталяна;
- Тэафіл Трызна з 1642 па 1645 г. Памёр на пасадзе ваяводы;
- Андрэй Масальскі з 1645 па 1651 гг. Памёр на пасадзе ваяводы [11, s. 9-10].

Трэба адзначыць, што ўрад берасцейскага ваяводы быў прывабным як для ўраднікаў агульнадзяржаўнага ўзроўню, якія не мелі сенатарскага статусу і былі тытулярнымі (А.Л. Радзівіл перайшоў на ваяводства з пасады крайчага ВКЛ, Я. Ракоўскі – з пасады надворнага падскарбія), такі і для мясцовага (М. Сапега і А. Масальскі раней па чарзе займалі пасаду менскага ваяводы) [11, s. 9–10].

Што давала чарговая намінацыя для рэальнага раскладу палітычных сіл у Берасцейскім павеце ў разглядаемы перыяд? Пасада ваяводы была ўплывовым інструментам фарміравання грамадскіх настрояў у павеце. Гэта разумелі і на каралеўскім двары, і ў магнацкіх колах, і ў асяроддзі царкоўных іерархаў. Невыпадкова ўніяцкі мітрапаліт Іосіф Вельямін Руцкі ў лістападзе 1634 г. нагадваў сенатару-каталіку Аляксандру Людвіку Радзівілу, берасцейскаму ваяводзе, пра неабходнасць падтрымкі уніі на сойміках і соймах [12, s. 428]. Самі пералічаныя асобы не былі адназначна самастойнымі гульцамі на палітычнай сцэне ВКЛ і ўваходзілі ў фактычна розныя групоўкі. Так, не маючага вялікіх амбіцый А.Л. Радзівіла ў гістарыяграфіі адносяць да ліку так званых рэгалістаў, праманархічна настроеных палітыкаў, але фактычна ён з'яўляўся і лідарам сваёй уласнай партыі, і прадстаўніком каталіцкай ці нясвіжскай групоўкі роду Радзівілаў, на чале якой быў канцлер ВКЛ Альбрыхт Станіслаў Радзівіл [3, s. 192–194; 13, s. 111, 125–126; 7, s. 58–65]. На пазіцыі берасцейскай шляхты вялікі ўплыў меў таксама той фактар, што канцлер А.С. Радзівіл у 1631 – 1656 гг. з'яўляўся пінскім старостам [10, s. 232], што вызначальным чынам адбівалася на палітычных пазіцыях суседняй пінскай шляхты [7, s. 58]. Аляксандр Людвік Радзівіл з 1616 г. лічыўся паўнапраўным берасцейскім абывацелем, валодаў пасля падзелу бацькоўскай спадчыны Белай і Дакудавым, да таго ж, з 1633 г. меў у Берасцейскай эканоміі наданне ад караля – "добра Воін" [14, s. 152, 154]. Невыпадкова, што берасцейскі соймік для Аляксандра Людвіка стаў стартавай пляцоўкай для набыцця палітычнага вопыту: на форумах берасцейскай шляхты ён прысутнічаў неаднойчы з 1620-х гадоў, а яго аўтарытэту хапала і для абрання дырэктарам сойміка, і для абрання соймавым паслом ад павета, і на ўключэнне прарадзівілаўскіх пунктаў у змест соймікавай інструкцыі [14, s. 151–152]. Так ці іначай, у асобе А.Л. Радзівіла мясцовая адміністрацыя займела далёка не старонняга кіраўніка. Па меркаванні сучаснікаў, ваявода быў "*разумным*" чалавекам *і* "*добрым каталікам*" [3, s. 192–193], што не перашкаджала яму актыўна супрацоўнічаць з біржанскімі Радзівіламі і лабіраваць іх інтарэсы. Такі падыход адбіваўся і на лаяльнасці, а магчыма, і на спрыянні з боку ваяводы асобам, звязаным з біражанскімі Радзівіламі.

Калі ў прызначэнні А.Л. Радзівіла на пасаду ваяводы была ўнутраная логіка, то з яго наступнікам сітуацыя выглядае больш празаічнай. Есць меркаванне, што ўрадніцкая кар'ера Яна Войцеха Ракоўскага пры Уладзіславе Вазе была "фатальна" звязана з удалым шлюбам [15, с. 25]. Сучаснікі скептычна ставіліся да патэнцыялу яго кар'ернага росту, паколькі Ракоўскі не карыстаўся асаблівай сімпатыяй з боку манарха [16, s. 342]. Спадзяванні Яна Ракоўскага на высокую пасаду, а ў 1635 г. ён імкнуўся атрымаць вялікае маршалкоўства ВКЛ, былі нерэалістычныя, паколькі ён канкурыраваў з буйнымі гульцамі – Радзівіламі і Сапегамі. Яго аўтарытэту хапіла толькі на тое, каб атрымаць намінацыю на ваяводства пасля Аляксандра Людвіка. Каталік польскага паходжання, ён не выяўляў асаблівай палітычнай актыўнасці і мала цікавіўся сітуацыяй у павеце, прынамсі, яе не кантраляваў, у тым ліку з-за кепскага стану здароўя. Урадніцтва Ракоўскага мела фармальны характар як ў часы займання пасады надворнага падскарбія, так і пазней. Калі ён нават на соймы не ездзіў, то на такія форумы, як павятовы соймік, тым больш не з'яўляўся. Пры аказіі Ракоўскі лёгка развітваецца з Берасцейскім ваяводствам і прымае іншую намінацыю [17, s. 518]. Асобным пытаннем застаецца яго палітычная прыналежнасць. Каралеўскага службоўцу, сыходзячы з веравызнання і паслуг двару яшчэ з часоў Жыгімонта Вазы, трэба залічваць да рэгалістаў. Ян Ракоўскі належаў да так званай чацвёртай сілы (групоўкі) ў ВКЛ на чале з Пацамі і Гасеўскімі, найбольшы ўплыў якой прыпаў на

1635 – 1638 гг. [2, с. 40]. З Пацамі берасцейскі ваявода Ракоўскі быў сапраўды звязаны самым непасрэдным чынам: яго маці была Сафія з роду Пацаў [15, с. 24].

Наступныя тры ваяводы распачыналі новы цыкл пашырэння палітычных уплываў у Берасцейскім павеце. Усе тры наступнікі Ракоўскага, несумненна, належалі да так званай сапегаўскай партыі ў ВКЛ. Няма сэнсу шмат казаць пра гэта ў адносінах Мікалая Сапегі, якога прызнавалі нават кіраўніком усёй сямейнай групоўкі. Мікалай Сапега быў таксама звязаны з Берасцейшчынай маёнткава: ён валодаў местам Кодань. Гэта прадвызначыла, што галоўнай арэнай палітычнай дзейнасці М. Сапегі ў 1610 – 1630-я гг. быў мясцовы соймік, ад якога ён абіраўся дэпутатам, паслом, дзе выступаў у ролі каралеўскага прадстаўніка [18, s. 125–126]. Сыход Мікалая на больш высокі ўрад у 1642 г., які быў часткай плана Уладзіслава Вазы па ўзвышэнні Сапег [2, с. 40–41], не змяняў становішча ў павеце. Наступны ваявода, Тэафіл Трызна, належаў да сям'і, звязанай з Сапегамі рознымі сувязямі, улучна са сваяцкімі: яго жонкай была Кацярына Сапега, дачка Мікалая [19, s. 125]. Да ліку сталых супрацоўнікаў сапегаўскай партыі належаў і князь Андрэй Фёдаравіч Масальскі, таксама, праз сваяцкія сувязі, звязанага з Сапегамі. Масальскі пачаў кар'ерны рост са "спадчыннага" гарадзенскага маршалкоўства, але ў 1627 г. быў намінаваны на ўрад берасцейскага кашталяна і займаў яго да 1643 г. [20, s. 133–134]. Вяртанне ў 1645 г. Масальскага ў іншым статусе аб'ектыўна ўмацоўвала сапегаўскую партыю.

Кашталянамі ў вылучаны час былі дзве асобы – згаданы Андрэй Масальскі і Францішак-Аляксандр Копаць. "Панам" берасцейскім апошні з'яўляўся з 1643 г. і да рэзыгнацыі ў 1651 г. [11, s. 100]. Як у адносінах да А. Масальскага, так і адносна Ф.-А. Копця можна ўпэўнена сцвярджаць: яны з'яўляся прадстаўнікамі сапегаўскай групоўкі [3, s. 207, 314]. Кантроль Сапегамі такога ўплывовага ўрада на працягу дзесяцігоддзяў даваў магчымасць мець сталы ўплыў на мясцовую шляхту.

Такім чынам, усё сенатарскія пасады ў Берасцейскім ваяводстве належалі каталікам, за выключэннем Тэафіла Трызны, які быў уніятам. Напрацягу 1630 – 1640-х гадоў ваяводскі ўрад паспеў пабываць у прадстаўнікоў трох розных палітычных сіл у ВКЛ, але ў апошнія гады праўлення Уладзіслава Вазы сенатары Берасцейшчыны прадстаўлялі адну палітычную сілу – партыю Сапег.

**Гродскі расклад.** У ваяводствах ВКЛ, якія складаліся з некалькіх паветаў, мясцовая гродская адміністрацыя непасрэдна падпарадкоўвалася старосце. Староста быў ключавой фігурай і ў Берасцейскім павеце. Вельмі адметна, што ў 1624 – 1652 гг. гэты ўрад займаў адзін чалавек – *Гедэон Міхал Трызна*. Як і іншыя прадстаўнікі роду Трызнаў, ён належаў да ліку бліжэйшых супрацоўнікаў сапегаўскай партыі [3, s. 200; 7, s. 50]. На аўтарытэт берасцейскага старосты ўплывала і тое, што ён быў стала звязаны з каралеўскім дваром, здабыў асаблівы давер манарха за час працы на ўрадзе земскага падскарбія, якім стаў у 1644 г. [16, s. 231–232]. Займаючы амаль на працягу 30 гадоў вышэйшы павятовы ўрад, ён мог непасрэдна ўплываць і на фарміраванне гродскай адміністрацыі ў павеце. Фактычна гэта азначае, што адпаведныя судовыя ўраднікі былі ў той ці іншай ступені залежныя ад старосты і яго сімпатый. Але ёсць і супярэчнасці, якія не дазваляюць сцвярджаць, што падпарадкаваны берасцейскаму старосце апарат фарміраваўся толькі ў адпаведнасці з партыйна-рэлігійнай прыналежнасцю працадаўцы. Так, напрыклад, выглядае сітуацыя з Пятром Пякарскім. Ён быў кальвіністам і слугой Радзівілаў [4, s. 347], але адначасова некаторы час, прынамсі, да 1624 г., калі берасцейскім старостай быў каталік Леў Сапега (узначальваў гродскую адміністрацыю з 1618 па 1623 гг.) [21], выконваў абавязкі берасцейскага гродскага суддзі [4, s. 347]. Цікава, што, па некаторых звестках, у 1629 г. кальвініст Пякарскі прадстаўляў павет на соймах і як гродскі суддзя [8, s. 164–165].

**Земскі расклад: адна адміністрацыя і чатыры партыі.** Павятовыя земскія ўрады былі прадметам сталай цікавасці палітычных груповак у ВКЛ. Свае людзі на пасадах былі большай гарантыяй для абароны групавых інтарэсаў. Натуральна, што і ў земскай адміністрацыі Берасцейскага павета не было аднастайнай палітычнай прыналежнасці. Даволі паказальнай з'яўляецца ў гэтым сэнсе гісторыя спіса асоб, якіх Уладзіславу Вазе у 1635 г. Крыштап Радзівіл прапаноўваў прызначыць на новастворaныя ў ВКЛ пасады [6]. Сам праект падрыхтаваў не хто іншы, як Пётр Кахлеўскі, давераная асоба і бліжэйшы сябра магната-кальвініста.

Радзівілаўскі слуга бачыў сітуацыю наступным чынам: урад берасцейскага падчашага належала аддаць Крыштафу Пякарскаму, які пакінуў кальвінізм і апынуўся ў ліку слуг А.Л. Радзівіла; пасада чашніка прызначалася для Пятра Пякарскага, сакратара яго каралеўскай міласці, але чашнікам стаў сапежынец Я.К. Умястоўскі. Новаўтвораны ўрад скарбніка таксама атрымаў не прыхільнік Радзівілаў, а рэгаліст Ян Уладзіслаў Невельскі [6, s. 100–101]. Вынікам гэтай гісторыі стала прасоўванне самога Кахлеўскага на ўрад войскага. Такім чынам, у 1635 г. былі прызначаны чатыры новыя асобы і ўсе яны *прадстаўлялі розныя палітычныя сілы*: каталіцкую галіну роду Радзівілаў, біржанскіх Радзівілаў, групоўку Сапег і прыдворную партыю. Не выклікае сумненняў, што і іншыя земскія ўраднікі прытрымліваліся рознай палітычнай арыентацыі, складаней адказаць на пытанне, якая партыя і калі мела больш прыхільнікаў. Дакладна можна толькі сцвярджаць, што нават пасля 1635 г., у часы астывання "любові" манарха да біржанскага клана [2, с. 40], біржанскім Радзівілам удавалася прасунуць патрэбных людзей на высокія павятовыя ўрады на Берасцейшчыне. Такі лёс напаткаў Пятра Пякарскага, які вядомы не толькі як парламентарый, але яшчэ і як актыўны дзеяч пратэстанцкай царквы: у 1635 г. ён фундуе кальвінскі збор у сваёй маёмасці Ямне

ў Берасцейскім ваяводстве [22, с. 347–352]. У 1637 г. каралеўскі сакратар П. Пякарскі прызначаецца на ўрад земскага суддзі, адну з ключавых пасад у мясцовай адміністрацыі [23].

**Соймікавы выбар.** Аўтарытэт высокіх урадаў, павага да арыстакратычнай крыві і грошай былі штодзённасцю для станавага грамадства Рэчы Паспалітай, але элементы дэмакратыі, прававой дзяржаўнасці часам выбівалі з-пад гэтых "традыцыйных каштоўнасцей" падмурак. Разгул свабоды нівеліраваў любы аўтарытэт, і мала што магло стрымаць самаўпэўненасць шляхты, асабліва, калі за яе плячыма стаялі іншыя высокія аўтарытэты – *браты павятовыя*. З імі лічыліся не толькі магнаты. Нават манарх часам быў вымушаны выкарыстоўваць прамы ціск на берасцейцаў за непадпарадкаванне яго волі. Падчас каранацыйнага сойма 1633 г. сама пазіцыя берасцейскіх паслоў, якія адступілі ад патрабавання павятовай інструкцыі і супраціўляліся ўвядзенню падаткаў, выклікала абурэнне манарха і прымусіла яго спецыяльна звяртацца да павятовых абывацеляў з асобным пасланнем [24, s. 46].

**Біржанская партыя: узлёт ці парытэт?** Пачаць варта з канстатацыі таго, што ў Берасцейскім ваяводстве біржанскім Радзівілам належала пэўная маёмасць, як і іх прыхільнікам ды слугам. Так, у Сельцах, якія належалі Багуславу Радзівілу, налічвалася 246 дымоў, а ў Камянецкім старостве Януша Радзівіла – 980 дымоў [3, s. 288–289]. Сам Берасцейскі павет з'яўляўся відавочна падзеленым па палітычных уплывах, што даволі выразна відаць па камплектах паслоў на соймы 1630 – 1640-х гадоў [8, s. 164–166]. У большасці выпадкаў да пачатку 1640-х гг. берасцейская шляхта абірала паслоў на парытэтнай аснове: адзін з'яўляўся пратэстантам-кальвіністам, другі належаў да адной з канкуруючых каталіцкіх груповак. Падтрымка кальвіністаў на берасцейскім сойміке мела месца і ў папярэднім дзесяцігоддзі, калі нават пасольскія інструкцыі, як у 1627 г., складаліся прыхільна ў адносінах да дысідэнтаў [8, s. 64]. Пазіцыі пратэстантаў заставаліся стабільнымі і на піке росту актываў біржанскіх Радзівілаў пры манаршым двары. Дысідэнты нават выступалі ў якасці каралеўскіх легатаў на берасцейскіх сойміках [8, s. 132]. У 1630-я гады, бадай, нязменнымі пасламі ад Берасця былі Пётр Пякарскі і Пётр Кахлеўскі. У некаторых выпадках, як на каранацыйным сойме 1633 г., увогуле толькі кальвіністы прадстаўлялі берасцейцаў у парламенце Рэчы Паспалітай [8, s. 165]. П. Пякарскі і П. Кахлеўскі былі бліжэйшымі супрацоўнікамі (слугамі-сябрамі) Крыштапа Радзівіла [4, s. 314–315, 347]. Клан Пякарскіх займаў нейкую спецыфічную нішу сярод землеўласнікаў павета. Знаменна, што езуіту Віюку Каяловічу, які жыў у сярэдзіне XVII ст. і з'яўляўся складальнікам гербоўніка шляхты ВКЛ, прозвішча Пякарскі было невядомым [25]. Пётр Пякарскі быў нашчадкам берасцейскага шляхціца Станіслава, уласніка маёнткаў *Трышын і Ямна*. Станіслаў Пякарскі быў звязаны з Радзівіламі і з'яўляўся даверанай асобай яшчэ Мікалая Радзівіла Сіроткі [26, с. 284–285]. Пётр Пякарскі не мог разлічваць на земскую кар'еру ў часы Жыгімонта Вазы, але яго веравызнанне не стала перашкодай для прызначэння гродскім суддзёй у Берасці. Палітычная актыўнасць гэтага шляхціца працягвалася некалькі дзесяцігоддзяў. У 1620-х гадах ён некалькі разоў абіраўся паслом, а ў другой палове 1630-х на змену П. Пякарскаму прыйшоў П. Кахлеўскі [8, s. 163–166]. У 1630-я гг. П. Пякарскі ў розных іпастасях з'яўляўся на соймы тройчы – у 1632–1633 гг. і 1634 г. [8, s. 165].

Пётр Кахлеўскі належаў да даволі заможных берасцейскіх шляхціцаў. Ён валодаў дзесяццю ўладаннямі [27, s. 216–217]. Аднак нягледзячы на адносную заможнасць П. Кахлеўскага, толькі смерць Жыгімонта Вазы адчыніла для яго магчымасць кар'ернага росту. Справа ў тым, што П. Кахлеўскі ў свой час быў замешаны ў авантуры, звязанай са спробай дэтранізацыі Жыгімонта Вазы, і не меў шанцаў на атрыманне намінацый [27, s. 216–217]. Пры новым уладары П. Кахлеўскі кампенсаваў страты часу і магчымасцей ды атрымаў, дзякуючы свайму патрону, пасады войскага, а потым берасцейскага земскага суддзі. Акрамя таго, ён шэсць разоў выбіраўся соймавым паслом і з'яўляўся адным з галоўных барацьбітоў за інтарэсы дысідэнтаў і біржанскіх Радзівілаў. Апошняе яго пасольства выпала на 1640 г. Нягледзячы на тое, што П. Кахлеўскі перажыў яшчэ некалькі соймавых кампаній, больш ён ні разу не быў запатрабаваны павятовай шляхтай. Што на гэта паўплывала, сказаць складана. Магчыма, сапраўды Крыштаф Радзівіл быў усім для свайго вернага слугі і смерць патрона перагарнула дагэтуль існы свет. Але адыход ад спраў Кахлеўскага не азначаў, што біржанскія Радзівілы страцілі ўплывы на мясцовую шляхту.

Парытэт палітычных сіл у павеце захоўваўся і ў пачатку 1640-х гадоў. Так, у 1642 г. паслом ад павета быў абраны кальвініст Андрэй Пякарскі [8, s. 166; 4, s. 347]. Але на прыканцы дзесяцігоддзя мясцовы соймік становіцца выразна прасапегаўскім [3, s. 314-215].

**Сапегі і сапежынцы.** Традыцыйнымі зонамі дамінацыі Сапег у ВКЛ з'яўляліся Слонімскі і Аршанскі паветы, а іншыя, такія як Віленскі, траплялі пад іх кантроль толькі ў выніку дзейнасці Льва Іванавіча Сапегі [5, s. 510]. Вядома, што ў Берасцейскім павеце пэўную кліенцкую базу фарміраваў яшчэ вялікі канцлер Л. Сапега, які, дарэчы, "купляў" прыхільнасць не толькі каталікоў, але і мясцовых кальвіністаў [5, s. 510]. Леў Іванавіч Сапега таксама не грэбаваў асабіста наведваць берасцейскія соймікі. Так, перадканвакацыйны соймік 1632 г. адбыўся пад дырэктарствам патрыярха роду. Акрамя яго, на тым жа сойміку прысутнічаў і Крыштаф Сапега, крайчы ВКЛ [8, s. 65]. Але нават удзел Льва Сапегі не перашкодзіў абранню паслом у Берасці пратэстанта А. Пякарскага [12, s. 390].

Напэўна, нельга казаць пра татальную дамінацыю ў Берасцейскім павеце сапегаўцаў, але тое, што павет разглядаўся імі як адзін з галоўных плацдармаў рэалізацыі палітычных планаў, – несумненна. Варта толькі звярнуць увагу на факт масавасці іх удзелу ў працы павятовага сойміка і на колькасць прыкладаў абрання саміх Сапег ды іх прыхільнікаў соймавымі пасламі. Асноўная прасапегаўская аўдыторыя ў павеце складалася з каталіцкай шляхты, якая мела там моцныя ўплывы [12, s. 390, 405].

Дэпапуляцыя, у выніку якой з жыцця ў 1630-х гадах пайшлі некалькі выдатных прадстаўнікоў роду, у вялікай ступені паўплывала на выцісканне Сапег на павятовы ўзровень. У паветах з традыцыйнай сапегаўскай дамінацыяй справа была вырашальная, а ў тых рэгіёнах, дзе не было абсалютнай перавагі, да палітычных кампаній прыцягваліся ўсе магчымыя сілы – ад сапегаўскіх кліентаў і сваякоў да асобных прадстаўнікоў роду. Найчасцей саміх Сапег сярод соймавых паслоў ад Берасцейскага павета можна было сустрэць у 1630-я гг.:

- 1632 г. (перадканвакацыйны соймік) – Крыштаф Сапега, крайчы ВКЛ.
- 1634 г. – Крыштап Сапега, крайчы ВКЛ.
- 1635 (II) г. – Мікалай Сапега.
- 1637 (II) г. – Мікалай Сапега.
- 1638 г. – Мікалай Сапега, харужы ВКЛ.
- 1646 г. – Павел Сапега, падстолі ВКЛ [8, s. 165–166].

Акрамя іх, пасламі абіраліся такія прадстаўнікі сапежынцаў, як староста берасцейскі Гедэон Трызна на канвакацыйны сойм 1632 г., Ян Казімір Умястоўскі – на каранацыйны сойм 1633 г. і на канвакацыйны 1648 г. Адным з галоўных актараў на берасцейскім сойміке ў 1640-х гг. стаў сапежынец Аляксандр Шуйскі [3, s. 303]. Берасцейскі войскі, потым харужы, ён прадстаўляў павет на соймах 1640 г., 1641 г., 1646 г., на канвакацыйным сойме 1648 г. [8, s. 166]. Канец 1640-х гг. увогуле сведчыць пра рост у павеце аўтарытэту партыі Сапег, якія цалкам кантралявалі мясцовыя соймікавыя нарады. Прыкладам можа быць перадканвакацыйны соймік у Берасці, на якім прысутнічаў партыйны актыў у складзе віцебскага ваяводы Паўла Сапегі, берасцейскага ваяводы Андрэя Масальскага з сынам Казімірам, падкаморыя берасцейскага Казіміра Тышкевіча і Яна Караля Копця, які быў абраны соймікавым дырэктарам [3, s. 314]. Вынікам такой дамінацыі быў кантроль за камплектацыяй пасольскай рэпрэзентацыі з ліку сваіх прыхільнікаў [8, s. 166].

**Дэпутаты-партыйцы**. Дадатковай ілюстрацыяй групавых арыентацый з’яўляюцца вынікі так званых грамнічных соймікаў, падчас якіх берасцейская шляхта штогод выбірала двух суддзяў (дэпутатаў) Галоўнага Трыбунала – вышэйшай апеляцыйнай установы ВКЛ [28]. Безумоўна, базавымі крытэрыямі, якім належала адпавядаць суддзям, былі не палітычныя погляды [8, s. 127–128]. Тым не менш, прыналежнасць да пэўнай групоўкі магла адыгрываць сваю ролю.

Спектр сімпатыі берасцейскай шляхты ў адносінах да кандыдатур быў дастаткова шырокім, а выбар сойміка нярэдка падаў на асоб, якія не займалі пасад і ніяк сябе не праявілі ў палітычным жыцці. Аднак у большасці выпадкаў шляхта аддавала перавагу прадстаўнікам лакальнай, у тым ліку ўрадніцкай, эліты. Даволі заўважнай актыўнасцю вызначаўся падчас грамнічных электаральных кампаній клан Шуйскіх, якіх рэгулярна падтрымлівалі берасцейкія абывацелі. Дэпутатамі ў 1634 г., 1635 г. і 1639 г. былі адпаведна абраныя Ян, Андрэй і Аляксандр Шуйскія [28, s. 214, 217, 230]. Сыходзячы з вядомай палітычнай пазіцыі мясцовага актывіста Аляксандра Шуйскага [3, s. 299, 303], можна дапусціць, што і іншыя прадстаўнікі гэтай сям’і належалі да сапегаўцаў. Двойчы, у 1639 г. і 1646 г., дэпутатам быў берасцейскі падкаморый К. Тышкевіч, пазней вядомы як сапежынец [28, s. 230, 253]. Як відаць па 1639 г., увесь камплект суддзяў мог складацца з прыхільнікаў адной групоўкі. Напэўна, залежным ад Сапег, прынамсі па службовай вертыкалі, быў дэпутат 1633 г. і 1640 г. Мікалай Табенскі [28, s. 211, 233].

Радзівілаўскі бок на сесіях Трыбунала рэпрэзентавалі Пякарскія [28, s. 221, 220], але не выключана, што былі і іншыя. Прынамсі, прозвішчы некаторых берасцейскіх дэпутатаў (Райскі, Язерскі) сустракаюцца ў спісах сем’яў, звязаных з біржанскімі Радзівіламі [28, s. 226, 236, 249; 4. s. 350, 371].

Папулярнасць некаторых мясцовых шляхціцаў лагічна трансфаміравалася ў магчымасць быць абранымі для выканання трох класічных функцый: *пасольскай, дэпутацкай і ўрадніцкай.* Так было ў выпадках П. Пякарскага і А. Шуйскага. Парадоксам з гэтай перспектывы выглядае выпадак з Пятром Кахлеўскім, які, пры ўсёй сваёй папулярнасці, ні разу не стаў дэпутатам [28]. Патлумачыць гэты казус тым, што ён часта быў соймавым паслом, нельга. Па-першае, соймы скліканіся не кожны год; па-другое, на ВКЛ не распаўсюджвалася канстытуцыя 1616 г. аб забароне сумяшчаць дэпутацкія і пасольскія функцыі [8, s. 129].

Пры ўсім тым, што многіх дэпутатаў можна адносіць ці да сапегаўскай, ці да радзівілаўскай групоўкі, іх пасада сведчыла аб тым, што яны адначасова, а магчыма, і ў большай ступені працавалі на прыдворную партыю. Так, у 1636 г. і 1643 г. берасцейская шляхта абрала дэпутатамі каралеўскіх сакратароў – Пятра Пякарскага і Яна Казіміра Умястоўскага, а ў 1634 г. – Максіміліяна Калечыцкага, каралеўскага двараніна [28, s. 220, 243, 214]. Пачаткова сапегаўскі слуга, Я.К. Умястоўскі [4, s. 357] быў пазней больш звязаны з дваром [7, s. 178].

**Заключэнне.** Берасцейскі павет і яго шляхта-абывацелі адыгрывалі важную ролю ў палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага. Там былі сканцэнтраваныя інтарэсы і ўладанні галоўных прэтэндэнтаў на дамінацыю ў краіне. Намінацыйная палітыка манархаў Рэчы Паспалітай выразна сведчыла пра жаданне бачыць на чале Берасцейскага ваяводства прадстаўнікоў арыстакратыі з ліку каталікоў. Ніжэйшы павятовы ўзровень рэпрэзентаваў інтарэсы чатырох палітычных сіл краіны, аднак рэальная канкурэнцыя ў Берасцейскім павеце ў 1630 – 1640-я гады адбывалася паміж галоўнымі палітычнымі групоўкамі – біржанскімі Радзівіламі і Сапегамі. Падтрымка берасцейскай шляхты пратэстантаў была асабліва заўважнай да 1640 г., пазней пачынаецца перыяд росту ўплываў Сапег. Берасцейскі павет вылучаўся тым, што стабільна выбіраў соймавымі пасламі пратэстантаў, найбольш актыўных і таленавітых прадстаўнікоў тагачаснага грамадства.

## ЛІТАРАТУРА


1. Rachuba, A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763 / A. Rachuba. – Warszawa : Wydawnictwo Sejmowe, 2002. – 376 s.
2. Рахуба, А. Палітычныя групоўкі ў ВКЛ (1569–1732) / А. Рахуба // Спадчына. – 2002. – № 5-6. – С. 32-46.
3. Lulewicz, H. Elita polityczno-społeczna Wielkego Księstwa Litewskiego w połowie XVII wieku: Praca doktorska napisana w Instytucie Historycznym Uniwersytetu Warszawskiego / H. Lulewicz. – Warszawa, 1984. – 488 s.
4. Augustyniak, U. W służbie hetmana i Rzeczypospolitej: Klientela wojskowa Krzysztofa Radziwiłła (1585–1640) / U. Augustyniak. – Warszawa : Wydawnictwo naukowe *Semper*, 2004 – 398 s.
5. Rachuba, A. Fakcja Lwa Sapiehy – zarys problematyki / A. Rachuba // Między Lwowem a Wrocławiem. Ksiega jubileuszowa profesora Krystyna Matwijowskiego. – Toruń : Wydawnictwo Adam Marszałek, 2006. – S. 503–511.
6. Rachuba, A. Kandydaci Piotra Kochlewskiego go nowych urzędów litewskich / A. Rachuba // Kwartalnik historychny. – 1991. – № 4. – S. 91–103.
7. Sawicki, M. Stronnictwo dworskie w Wielkim Ksienstwie Litewskim w latach 1648-1655 / M. Sawicki. – Opole, 2010. – 380 s.
8. Konieczna, D. Ustrój i funkcjonowanie sejmiku brzesko-litewskiego w latach 1565–1763 / D. Konieczna. – Warszawa : Wydawnictwo – DiG, 2013. – 198 s.
9. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVIII wieku : spisy. – T. I: Województwo wileńskie XIV – XVIII wiek / pod red. Andrzeja Rachuby. – Warszawa: «DiG», 2004. – 764 s.
10. Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII-XVIII wieku: Spisy / Pod red. A. Gąsiarowskiego. – Kórnik : Biblioteka Kórnicka, 1994. – T. 11: Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV – XVIII wieku. Spisy / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba ; PAN. Bibl. Kórnicka. – 255 s.
11. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Ksęstwa Litewskiego 1386–1795 / J. Wolff. – Kraków : Druk. Wł. Ananicza i Spółki, 1885. – 351 s.
12. Kempa, T. Wobiec kontrreformacji. Protestanci i prawosławni w obronie swobód wyznaniowych w Rzeczypospolitej w końcu XVI i pierwszej połowie XVII wieku / T. Kempa. – Toruń : Wydawnictwo Adam Marszałek, 2007. – 624 s.
13. Dzięgielewski, J. Izba poselska w systemie władzy Rzeczypospolitej w czasach Władysława IV / J. Dzięgielewski. – Warszawa : Wydawnictwo sejmowe, 1992. – 183 s.
14. Jaroszuk, J. Radziwiłł Aleksandr Ludwik / J. Jaroszuk // Polski słownik biograficzny. – T. XXX. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1987. – S. 150–155.
15. Папко, В. Партрэт брэсцкага ваяводы Яна Ракоўскага (каля 1594–1639) / В. Папко // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 10. – С. 23–28.
16. Filipczak-Kocur, A. Skarbowość Rzeczypospolitej 1587–1648. Projekty-ustawy-realizacja / A. Filipczak-Kocur. – Warszawa, 2006. – 440 s.
17. Nagielski, M. Rakowski Jan Wojciech / M. Nagielski, T. Wasilewski // Polski słownik biograficzny. – T. XXX. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1987. – S. 517–519.
18. Nagielski, M. Sapieha Mikołaj / M. Nagielski // Polski słownik biograficzny. – T. XXXV. – Warszawa-Kraków : Drukarnia Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1994. – S. 124–127.
19. Niesiecki, K. Herbarz polski / K. Niesiecki. – Lipsk : Nakładem i drukiem Breitkopfa i Hærtela, 1842. – T. IX. – 469 s.
20. Wasilewski, T. Massalski Andrzej / T. Wasilewski // Polski słownik biograficzny. – T. XX. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1975. – S. 133–134.
21. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Метрыка ВКЛ. – Адз. зах. 93. – Л. 160адв. – 161адв.
22. Акты, издаваемые археографическою комиссиею высочайше учреждённою в Вильне. – Т. II.: Акты Брестского земского суда. – Вильна : Тип. Губ. Правления, 1867. – X, 362 с.
23. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску. – Метрыка ВКЛ. – Адз. зах. 113. – Л. 74адв.
24. Wisner, H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z czasów Zygmunta III i Władysława Wazy / H. Wisner. – Warszawa : Wydawnictwo NERITON, 2001. – 144 s.
25. Kojałowicz, W. W. Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego tak zwany Compendium czyli o klejnotach albo herbach których familie stanu rycerskiego w prowincyach Wielkiego Xięstwa Litewskiego zażywają / W. W. Kojałowicz. – Kraków : W Drukarni "Czasu" Fr. Kluczyckiego i Spółki, 1897. – 527 s.
26. Кэмпа, Т. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка (1549–1616). Віленскі ваявода / Т. Кэмпа. – Мір : Музей «Замкавы комплекс «Мір», 2016. – 508 с.

27. Trawicka, Z. Piotr Kochlewski / Z. Trawicka // Polski słownik biograficzny. – T. XIII. – Wrocław etc. : Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1967–1968. – S. 216–217.
28. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696) : spis / pod red. Andrzeja Rachuby. – Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2007. – 470 s.

*Пастуniў 29.01.2021*

**BREST REGION IN THE POLITICAL GEOGRAPHY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 1630 – 1640 s**

***V. HALUBOVICH***

*The article presents the results of the study of the role and place of the Brest County in the political life of the Grand Duchy of Lithuania in the 1630s and 1640s. The author drew attention to the unexplored local political history in the Belarusian historiography and fragmentary information about the specifics of the political forces structure in the Brest region in foreign historiography. The article notes that political competition in Brest was a reflection of the processes that took place at the national level. The leadership of the Brest Voivodeship changed several times during the 1630s and 1640s, and the voivodeships were persons belonging to three different political groups, including the Radzivil and Sapega ones. The local administration of the County was formed from local gentry, that also oriented one of the political groups. Despite the fact that the main Voevode and County posts belonged to Catholics and Uniates, the Protestant group of the Grand Duchy of Lithuania led by the Radzivils from Birzhy was very popular among the local gentry. One of the County leaders and the main representative of Protestant interests at the Sejms of the Polish-Lithuanian Commonwealth was the famous Brest nobleman Peter Kohlevsky.*

***Keywords:*** *gentry, Brest region, the Grand Duchy of Lithuania, governor of province, the Radzivils, the Sapegas.*